# Вусны часопіс “Які ж гэта цуд – беларуская мова!”

Пазакласнае мерапрыемства па беларускай мове,
прысвечанае Міжнароднаму дню роднай мовы
для вучняў 4-5 класаў

**Т. В. Пашалюк,**
настаўнік пачатковых класаў
Пагост-Загародскай СШ
імя славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія Пінскага раёна

**ЗАДАЧЫ:** пашырыць веды дзяцей аб гістарычным шляху беларускай мовы; працягваць работу па раскрыцці багацця і разнастайнасці роднай мовы, ствараць умовы для выхавання цікавасці да роднай мовы, яе хараства і прыгажосці, беражлівых адносін да духоўнай спадчыны беларускага народа.

**АБСТАЛЯВАННЕ:** часопісы, музычны запіс, карткі-заданні, куфэрак, выказванні аб роднай мове, медалі для ўзнагароды, фразеалагічны слоўнік беларускай мовы, малюнкі з выявамі народных свят.

Клас дзеліцца на дзве групы з роўнай колькасцю дзяцей “Званочкі” і “Васількі”.

**Ход мерапрыемства:**

**Уступнае слова настаўніка**. Добры дзень, дзеці! Якое марознае надвор’е! А ў нашым класе цёпла і ўтульна. Цёпла ад таго, што сабраліся людзі, якія з задавальненнем вывучаюць родную мову, размаўляюць на ёй, любяць яе, неабыякава ставяцца да яе нялёгкага і ў той жа час цікавага лёсу.

- Паглядзіце, калі ласка, на выставу, што вы бачыце?(Адказы дзяцей.)
- Так, гэта беларускія часопісы.
- Якія часопісы вы выпісваеце? (Адказы дзяцей.)
- Можа хто з вас ведае, як называецца першы беларускі часопіс для дзяцей? (Адказы дзяцей.)

Так, першы беларускі часопіс для дзяцей і моладзі называўся “Лучынка” і друкаваўся яшчэ да рэвалюцыі. Друкаваліся ў ім казкі, вершы, загадкі, дзіцячыя песні. Рэдакцыя часопіса імкнулася навучыць дзяцей любіць родную мову, разумець яе прыгажосць.

Сёння мы з вамі адправімся ў падарожжа па старонках часопіса, назва якога “Які ж гэта цуд – беларуская мова!” А часопіс незвычайны. Гэта вусны часопіс.

**Першая старонка** часопіса прысвечана гісторыі нашай мовы і называецца **“Мінулае роднага слова”**.

Я.Колас пісаў: “Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю”.

Калі ўзнікла наша мова, гэта невядома. Дакладна вядома, што яна існуе шмат стагоддзяў і належыць да славянскай групы слоў. Славяне, якія жылі ад Дуная да Дона, карысталіся адной мовай. Якой была мова 800 ці 1000 гадоў назад нельга сказаць. З гісторыі вядома: у XVI стагоддзі выйшла ў свет першая друкаваная кніга з рысамі жывой беларускай мовы.

Назваць прозвішча чалавека, які заснаваў беларускае кнігадрукаванне дапаможа шыфроўка.

Вам трэба закрэсліць літару, якая паўтараецца, і тады атрымаеце адказ.

ССВВФУУРЯЯАЧЧНЦЕЕЫСББКШШ
ЗЗСКООАППРЫЮЮНЛЛАДД.

(Адказы ўдзельнікаў.)

Правільна, гэта Францыск Скарына.

- Як называлася першая кніга на беларускай мове? (Адказы дзяцей.)

У 1517 годзе выйшла ў свет першая друкаваная кніга, выдадзеная Скарынам.

Далей: 1529 год – першы Статут ВКЛ: поўны збор законаў па-беларуску.

1566 год – другі Статут ВКЛ: беларуская мова – дзяржаўная ў ВКЛ. Затым амаль тры стагоддзі беларусы мелі вельмі абмежаваныя магчымасці для развіцця сваёй культуры на роднай мове. Толькі ў 20-ыя гады XX стагоддзя пачалося адраджэне беларускай мовы. Яно было нядоўгім. Пачалася страта беларускай мовы: мову перасталі ўжываць у дзяржаўных установах, зменшылася колькасць беларускіх школ. І нарэшце, у 1990 годзе беларуская мова зноў стала дзяржаўнай.

Цяпер, калі створаны ўсе ўмовы для развіцця роднай мовы, мы павінны клапатліва ахоўваць моўныя скарбы.

Успамінаюцца словы А.Гаруна:

Дык шануй, беларус, сваю мову –
Гэта скарб наш на вечныя годы…

**Другая старонка** часопіса **“Непаўторны свет фальклору”**.

- Што такое фальклор? Як можна сказаць інакш? (Адказы дзяцей.)
- Чаму народная творчасць? (Адказы дзяцей.)

Тых людзей ўжо даўно няма, а іх творы жывуць, вучаць і радуюць нас.

Пералічыце жанры вуснай народнай творчасці, з якімі пазнаёміліся на ўроках беларускай літаратуры.

Састаўленне кластара.

Вусная народная творчасць

(Фальклор)




Асабліва ўсе любяць слухаць і адгадваць загадкі. Загадкі вучаць думаць, развіваюць кемлівасць, фантазію, узбагачаюць слоўнікавы запас.

(Па чарзе дастаем з куфэрка і адгадваем.)

- Што чалавеку самае мілае? (Сон.)
- Чаго на свеце багацей няма? (Зямлі.)
- Што гэта за маці – не ведае роднага дзіцяці? (Зязюля, адкладвае яйкі ў гнёзды іншых птушак.)
- Як тая рэч завецца, што цэлы год лічыць і ніколі не саб'ецца? (Каляндар. У календары столькі лісточкаў, колькі дзён у годзе. Ен дапамагае нам лічыць дні, каб мы не зблыталі іх.) На дошцы дэманструюцца малюнкі-адгадкі.

Далей рэбус-загадка. Для таго каб назваць адгадку, трэба яшчэ ўзнавіць змест загадкі.




(Днём акно разбіта, а за ноч устаўлена. (Лёд у палонцы.))

Цудоўна! Кемлівасці вам не займаць. Давайце ўспомнім з урокаў беларускай літаратуры, што такое прыказка і прымаўка? (Адказы дзяцей.)

Прыказка – гэта кароткае, але вельмі трапнае выказванне аб жыцці, аб чалавечых якасцях, аб любові да маці, да бацькоўскага парога, да роднай мовы. Часта ў жыцці мы карыстаемся гэтымі мудрымі парадамі.

У куфэрку знаходзяцца наступныя заданні. Ваша задача – назваць беларускія народныя казкі, з якіх узяты гэтыя прыказкі і прымаўкі.

1. Жыццё пражыць – не поле перайсці. (“Стары бацька.”)
2. І Кузьму бацькам назавеш. (“Недалікатны сын.”)
3. Свет вялік, можа і праўда. (“Пан і казачнік.”)

А зараз вам патрэбна ўзнавіць прыказкі і прымаўкі па пары слоў.

Шыла – мяшок. (Шыла ў мяшку не схаваеш.)

Дым – агонь. (Не бывае дыму без агню.)

Сонейка – мамачка. (Пры сонейку цёпла, пры мамачцы добра.)

Хлеб – праца. (Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.)

Наступнае заданне патрабуе ад вас найбольшай ўвагі цярмення.

Гульня “ Шыфраванка”. Замяніць фігуры літарамі і прачытаць прымаўку, якая атрымалася.

| ■ | ● | □ | ○ | ♦ | ◊ | ▭ | ▬ | △ | ▲ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| т | а | в | х | ў | с | і | м | б | г |

| ■ | ● | ■ | ● | □ | ● | ○ | ● | ■ | ● | ♦ | ◊ | ▭ | ▬ | △ | ● | ▲ | ● | ■ | ● |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

(Татава хата ўсім багата.)

Вашай увазе прапануюцца дыялогі з прыказкамі і прымаўкамі. Ваша задача назваць іх. (Дыялогі разыгрывае група дзяцей.)

–Ты што гэта робіш з катом, Яська?
–Гуляю.
–Ты яго мучыш, тузаеш. Каб з табою так гулялі, ці добра было б табе?
–Нядобра.
–Ну дык вось: не рабі другому, што не люба самому.

–Бабулька, ты казала, што мы пойдзем гуляць?
–Пойдзем. Унучка, скажы, ці памыла ты ўжо посуд?
–Я потым памыю.
–Не. Адклад не ідзе ў лад. Памый чысценька посуд, тады і пойдзем.

**Наступная старонка – старонка адпачынку**.

Ой, музыка, рэж за двох,
Не шкадуй ты маіх ног.
Мае ногі не баляць,
Яны хочуць танцаваць!

(Дзеці выконваюць практыкаванні пад мелодыю беларускай народнай песні “Лявоніха.”)

Лістаем часопіс далей. І вітаюць нас **“Вясёлыя хвілінкі**”. Нашы людзі вельмі таленавітыя, кемлівыя, любяць і цэняць гумар. А каб упэўніцца ў гэтым,

давайце паслухаем беларускія народныя пацешкі ў выкананні нашых аднакласніц. (Выступае група дзяцей.)

– Чаму ты ўчора не быў у школе?
– Мой старэйшы брат захварэў.
– А ты тут пры чым?
– А я катаўся на ягоным веліку.

У пятніцу, калі Паўлік збіраўся ў школу, маці сказала:

– Вось атрымаеш сёння дзясятку – паедзеш заўтра з татам на рыбалку. На цэлы дзень!

Прыйшоў Паўлік са школы і кажа:

– Мама, на рыбалку я заўтра паеду на паўдня.

Бабуля кажа Марынцы:

– Хутка будзе дождж.
– Чаму?
– Куры на жэрдку паселі, прыкмета – на дождж.
– Зараз я іх адтуль зганю, бо я на возера ісці збіраюся.

---

– Рыгорка, чаму ты кожны дзень спазняешся ў школу? Няўжо ў вас няма будзільніка?
– Будзільнік ёсць, ды толькі ён звоніць, калі я сплю.

---

Малайцы, дзеткі. Павесялілі. А мова якая, мова! Дасціпная і мілагучная, прыгожая і вясёлая!

І яшчэ некалькі заданняў для ўсмешкі.

- Якую мелодыю чакаюць вучні ў канцы ўрока?(Званок.)
- Якая музычная нота патрэбна для супу? (Соль.)
- Што нават і сляпы пазнае? (Крапіва.)
- Пад якім кустом заяц спіць у дождж? (Пад мокрым.)

**Пятая старонка** і самая складаная **“Сінонімы. Антонімы. Фразеалагізмы.”**

З урокаў беларускай мовы вы ведаеце, што такое сінонімы, антонімы, як інакш называюцца фразеалагізмы і для чаго ўжываюцца ў мове.

І першае заданне: падбярыце да назоўнікаў па два словы з блізкім значэннем.

Мяцеліца (завея, завіруха, бура).

Дарога (сцежка, гасцінец, шлях).

Другое заданне: падабраць да кожнага слова антонім з той жа колькасцю літар.

Здароўе (хвароба).

Сябар (вораг).

Учора (сёння).

Мінулы (будучы).

Трэцяе заданне цяжкае, але, на мой погляд, вельмі цікавае.

Пра якога чалавека так кажуць?

- Па слова ў кішэнь не лазіць. (Пра знаходлівага.)
- З галавой на плячах. (Пра разумнага.)
- З адкрытай душой. (Пра шчырага.)
- Кату па пяту або вераб'ю па калена. (Пра вельмі малелькага.)

Дапоўніце фразеалагізмы, дапісаўшы словы, якіх не хапае.

- Як гром … (з яснага неба).
- Кідаць словы … (на вецер).
- Ні слыху …(ні дыху).
- Паказаць, дзе … (ракі зімуюць).

Разумнічкі. І з гэтым заданнем справіліся на выдатна.

**Шостая старонка** дапаможа ўспомніць народныя святы і называецца **“Народны каляндар”**.

Паглядзіце на малюнкі з выявамі розных свят, якія адзначаюцца ў Беларусі, у нашай мясцовасці. Многія з вас прымалі ўдзел ў іх святкаванні, віншавалі родных, радавалі выступленнем сваіх аднавяскоўцаў, спявалі народныя песні, удзельнічалі ў конкурсах. Таму цяжкасці яно ў вас не выклікае.

Ваша задача: назваць свята і расказаць пра яго традыцыі.

Каляды – першае зімовае свята беларусаў. Калядуюць 7 студзеня. Звездары носяць па вуліцы звязду. Ходзяць па хатах , спяваюць песні, жадаюць шчасця і дабрабыту гаспадарам. Пасля спеваў гаспадары даюць ласункі, грошы.

Шчадруха. У гэтую ноч сустракаюць Новы год па старому стылю. Пераапранаюцца ў казу, так як каза лічыцца духам поля, добрага ўраджаю. Шчадроўнікі ходзяць па хатах і жадаюць гаспадарам і іх дзецям здароўя, багацця, шчасця. За гэта гаспадары частуюць рознымі прысмакамі.

Масленіца працягваецца цэлы тыдзень. У гэты час забараняецца есці мяса. Яго замяняюць бліны з маслам. Бліны лічацца сімвалам сонца, надыходзячай вясны. Робяць і запальваюць кола, сімвалічна спальваюць ляльку, якая ўвасабляе зіму. Таксама спяваюць песні, праводзяцца розныя конкурсы і спаборніцтвы.

Вялікдзень. Галоўнае свята ўваскрэсення распятага Хрыста. Вялікодная ноч з суботы на нядзелю – святочная. Людзі ідуць у царкву. Зранку пасля богаслужэння ідуць дамоў, запальваюць асвенчаныя свечы, накрываюць святочны стол. Галоўнымі стравамі з'яўляюцца фарбаваныя яйкі, пасха, кулічы.

Днём з крашанкамі выходзяць на вуліцу і пачынаецца гульня з біццём яек.

Малайцы. Падрабязна і змястоўна расказалі пра традыцыі святкавання галоўных свят.

**Заключнае слова настаўніка:**

Закрыта апошняя старонка часопіса. Усе вы мяне вельмі парадавалі актыўнасцю, жывасцю, адказамі на роднай мове. Мы яшчэ раз упэўніліся ў тым, якая багатая, цудоўная і займальная беларуская мова. Не мова – проста цуд. Канешне, не да ўсяго багацця ўдалося дакрануцца. Часу не хапіла. Але я

спадзяюся, што гэтая сустрэча прайшла для вас не дарэмна, прынесла нешта новае і незабыўнае,  кранула вас. І яна не апошняя.

Вялікі дзякуй за працу.

Закончыць наша мерапрыемства хочацца словамі М.Дуксы:

Я роднае слова люблю без прымусу,
Яно мне аж свеціцца – кожнае, кожнае.
Вы ганарыцеся, беларусы –
Наша мова такая прыгожая!

Няма моў прыгожых і непрыгожых, багатых і бедных. Ёсць толькі родная і няродная. Размаўляйце на роднай мове, па-беларуску і не трэба будзе думаць “звóнят” ці “звоня́т”, таму што вам тэ-ле-фа-ну-юць.

Літаратура:

1.Кучынская, С.І.Займальны матэрыял па літаратурным чытанні. 2-4 класы./С.І. Кучынская. – Мазыр, 2012. – 102 с.

2.Сямак, А.Л. Алімпіяды па беларускай мове. 2-4 класы./А.Л. Сямак. – Мінск, 2016. – 126 с.